*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984

22 САКАВІКА

ЧАЦВЕР

№ 10 (1423)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

· Учора · Сёння · Заўтра ·

### *НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ*

прэзідыума студэнцкага прафкома абмеркавана работа прафсаюзных арганізацый фізічнага факультэта і факультэта журналістыкі па выхаванню ў студэнтаў пачуцця беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці. Разгледжана таксама пытанне аб рабоце прафсаюзнага бюро факультэта радыёфізікі і электронікі з першакурснікамі.

Н. ТУРОМША,
намеснік старшыні студэнцкага прафкома.

### *ПРАФЕСІЙНАМУ СВЯТУ*

работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі і бытавога абслугоўвання насельніцтва прысвяцілі свой канцэрт удзельнікі народнага ансамбля танца «Крыжачок».

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### *СУСТРЭЧА*

з Героем Савецкага Саюза, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны лётчыкам Б. І. Коўзанам прайшла на механіка-матэматычным факультэце. Прысутныя пачулі ўсхваляваны расказ ветэрана аб суровых днях барацьбы савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, успаміны аб паветраных баях, у якіх ён прымаў удзел. Б. І. Коўзан выказаў упэўненасць, што сённяшняе маладое пакаленне — пакаленне 80-х — будзе дастойна працягваць слаўныя традыцыі сваіх бацькоў.

Г. ЗАЙЦАВА,
студэнтка механіка-матэматычнага факультэта.

### *АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ*

у рабоце канферэнцыі «Юнацтва планеты змагаецца за мір», якая прайшла ў Сёмкаўскай сярэдняй школе Мінскага раёна, прынялі замежныя студэнты, што вучацца на факультэце журналістыкі.

АБДУЛЬМАДЖЫД АБДУЛЬКАДЭР,
студэнт факультэта журналістыкі.

### *ПА ЗАПРАШЭННЮ*

камітэта камсамола і савета дружбы факультэта журналістыкі ў госці да студэнтаў прыйшла галоўны рэдактар часопіса «Работніца і сялянка» М. І. Карпенка. Яна расказала аб сваёй журналісцкай дзейнасці, аб тым, як выбрала гэту прафесію.

АБДУЛЬМАДЖЫД АБДУЛЬКАДЭР,
студэнт факультэта журналістыкі.

● КАНФЕРЭНЦЫЯ ●

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ



У БДУ ПРАЙШЛА рэспубліканская студэнцкая навуковая канферэнцыя па выніках трэцяга тура Х Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. Адкрыў канферэнцыю сакратар ЦК ЛКСМБ А. П. ХАНДОГІН. Удзельнікаў канферэнцыі вітаў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ. З дакладам аб далейшым развіцці студэнцкіх навуковых даследаванняў у рэспубліцы выступіў начальнік упраўлення выкладання грамадскіх навук МінВНУ БССР Н. В. Рабаконь. Незабыўныя імгненні канферэнцыі адлюстраваў на здымках наш фотакарэспандэнт С. ПЛЫТКЕВІЧ.

(Заканчэнне на 2-й стар.).











## ● ВУЧОБА КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ ●





Плённа прайшла трохдзённая выязная вучоба камсамольскага актыву універсітэта ў алімпійскім спорткомплексе «Стайкі». Сакратары факультэцкіх камсамольскіх арганізацый і іх наменікі па арганізацыйнай, ідэалагічнай рабоце, працоўнаму выхаванню набылі неабходныя веды па ўдасканаленню камсамольскай дзейнасці.

Фота **С. Плыткевіча.**



## ● КАНФЕРЭНЦЫЯ ●

# СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ

**Усесаюзныя конкурсы студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху сталі традыцыйнымі. На працягу 17 гадоў яны паспяхова выконваюць пастаўленую задачу — выхоўваць маладое пакаленне ў духу камуністычных ідэалаў.**

БОЛЬШАСЦЬ даследаванняў, прадстаўленых на рэспубліканскі конкурс, прысвечаны ўдасканаленню развітога сацыялізму: праблемам развіцця сацыяльна-класавай структуры сацыялістычнага грамадства, інтэрнацыяналізацыі сацыяльнага жыцця, развіцця сацыялістычнага народаўладдзя, кіравання сацыяльнымі працэсамі ў развітым сацыялістычным грамадстве, фарміравання разумных патрэбнасцей савецкай моладзі ва ўмовах сацыялістычнай рэчаіснасці.

Ва ўсіх трох турах конкурсу прыняло ўдзел 108 тысяч чалавек, або 98,5 працэнта ўсіх студэнтаў дзённай формы навучання. Значна ўзрос удзел у конкурсе студэнтаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, Брэсцкага інжынерна - будаўнічага інстытута, Віцебскага медыцынскага і Мозырскага педагагічнага інстытутаў.

На рэспубліканскі тур Х Усесаюзнага конкурсу было прадстаўлена ў адпаведнасці з устаноўленай нормай 240 студэнцкіх работ 30 работ, выкананых замежнымі студэнтамі.

У выніку рэцэнзіравання на рэспубліканскім туры студэнцкія даследаванні былі ацэнены наступным чынам:

— па гісторыі КПСС — «выдатных» — 19, «добрых» — 17, «здавальняючых» — 5 работ;

— па філасофіі — «выдатных» — 19, «добрых» — 21, «здавальняючых» — 6 работ;

— па палітычнай эканоміі — «выдатных» — 21, «добрых» — 37, «здавальняючых» — 15 работ;

— па навуковаму камунізму — «выдатных» — 15, «добрых» — 25, «здавальняючых» — 6 работ;

— па гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху — «выдатных» — 6, «добрых» — 15, «здавальняючых» — 3 работы.

Асаблівасцю конкурсу з'яўляецца ўдзел у ім шматлікіх пасланцоў моладзі з сацыялістычных краін і краін, якія развіваюцца: ГДР, Венгрыі, Чэхаславакіі, Балгарыі, Польшчы, Кубы, В'етнама, Сірыі, Беніна, Мазамбіка і іншых.

# ТРЫНАЦЦАТЫ ВЫХАДНЫ

### ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ ТВАЙГО ВОЛЬНАГА ЧАСУ

**На вуліцы растае снег. Ідзе вясна. Семестр хоць ужо і працягваецца месяц, але вялікага напружання яшчэ не адчуваецца. Кожны тыдзень — нядзеля, выхадны дзень. Дзень, калі не трэба ісці на заняткі, калі можна не спяшацца. У гэтым годзе 53 дні прыходзіцца на нядзелю, дабаўляецца яшчэ шэсць дзён, адзначаных у календары чырвоным колерам, і атрымліваецца 59 дзён, не лічачы канікул. 18 сакавіка быў 13 днём. Трынаццатым днём адпачынку. У суботу, 17 сакавіка, мы звярнуліся да студэнтаў з пытаннем, як яны будуць праводзіць свой выхадны дзень.**

— ДЛЯ МЯНЕ 18 сакавіка будзе звычайным днём,— сказаў студэнт 2 курса факультэта журналістыкі ленінскі стыпендыят Ігар Зыбайла.— Пайду ў бібліятэку, папрацую над курсавой работай. Нядзеля — такі дзень, калі можна зрабіць вельмі многае. Патрэбна толькі спланаваць час.

Зоя Кантунчык, студэнтка 4 курса факультэта прыкладной матэматыкі, на хвіліну сумелася:

— Што буду рабіць? Мы збіраліся з сябрамі ў паход, дакладней — хацелі выехаць за горад. Але, бачыце, надвор'е не спрыяе. Абавязкова сходзім у кінатэатр, паглядзім новы фільм.

На геаграфічным факультэце ў суботу было ажыўлена ў калідорах.

— Што робіце? — пытаюся ў дзяўчыны.

— Рэпеціруем. А што заўтра будзем рабіць? Рэпеціраваць, рыхтавацца да універсітэцкага агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці.

Старшыню спортбюро факультэта радыёфізікі і электронікі А. Кулінку сустрэў у спартыўным клубе. Ён прывёз сюды насценныя спартыўныя газеты.

— Вось бачыш, нашы студэнты на марш-кідку. Кожную нядзелю ў нас нешта цікавае. Любяць радыёфізікі спорт. А заўтра пастараюся схадзіць у Палац спорту, дзе праходзіць чэмпіянат краіны па цяжкай атлетыцы. Хачу паглядзець на асілкаў.

— У мяне гэты дзень будзе самым радасным у годзе,— сказаў чацвёртакурснік факультэта журналістыкі Аляксандр Папко.—Мне спаўняецца дваццаць пяць гадоў. Буду заўтра ўвесь час з сябрамі.

Альпіністы універсітэта збіраліся ў дарогу. Нават распытаць як след не ўдалося.

— Едзем у Баяры на закрыццё лыжнага сезона. Сёння і заўтра будзем на лыжах. Цудоўна!

Мой сябар з інтэрната № 2 у адказ пацягнуўся і прамармытаў:

— Паглядзім.

— А канкрэтней?

— Ну, прыйду з дыскатэкі.

— Гэта з гэтай таўканіны?

— Хай будзе так. І лягу спаць.

— І ў колькі прыйдзеш?

— У гадзін шэсць... Увесь дзень буду спаць...

У кожнага — свой рэцэпт выхаднога дня. Які лепшы? Напэўна, той... Стоп. Успомнім: вольны час — наша багацце. Прапануем чытачам уключыцца ў размову, як лепш правесці свой вольны час.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

## ● МІТЫНГ ●

# МЫ З ТАБОЙ, ГРЭНАДА!

**НА ФАКУЛЬТЭЦЕ журналістыкі адбыўся мітынг салідарнасці з народам Грэнады. Пяць гадоў назад маленькая дзяржава ў раёне Карыбскага басейна атрымала незалежнасць. А сёння на зямлі Грэнады праліваецца кроў яе патрыётаў, там гаспадараць амерыканскія акупанты.**

**На мітынгу прысутнічалі студэнты з розных краін свету, што вучацца на аддзяленні міжнароднай журналістыкі. Сярод выступаўшых былі прадстаўнікі зямляцтваў Афганістана, Палясціны, НДРЙ, Балівіі, Эфіопіі. Яны горача гаварылі аб тым, што ўсе прагрэсіўныя людзі свету падтрымліваюць барацьбу, якую вядзе герагічны народ Грэнады супраць амерыканскіх захопнікаў, і выказалі надзею, што сённяшняе становішча будзе захоўвацца не доўга, і хутка народ Грэнады будзе адзначаць дзень перамогі над амерыканскімі інтэрвентамі.**

**Студэнты з Лацінскай Амерыкі падзякавалі прысутным за падтрымку народаў, якія вядуць вызваленчую барацьбу.**

**АСКАР САНХІНЕС,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# ЗРУЧНАСЦІ... АДМЯНЯЮЦЦА

## ● САТЫРЫЧНЫМ ПЯРОМ ●

ПАВАЖАНЫ ЧЫТАЧ, уяўляю, як нялёгка табе будзе перастройвацца, каб авалодаць усёй вастрынёй разважанняў катэгарычна заклапочанага чалавека. Шчыра папярэджваю, што гэта не проста. Таму дазволь прапанаваць табе сваю пасрэдніцкую дапамогу. Бо шляхамі такіх-сякіх меркаванняў у гэтым напрамку раней за цябе прайшло ўжо шмат тых, хто здолеў у свой час арганізавацца, забяспечыцца правамі, высветліць сваё прызначэнне і нават па сённяшні дзень спраўна атрымліваць грошы з касы Белдзяржуніверсітэта. Карацей кажучы, размова ідзе пра службу жыллёва-камунальнай гаспадаркі інтэрнатаў № 2 і № 4.

А разважаюць прадстаўнікі гэтай службы наступным чынам: «Вы толькі паспрабуйце ўявіць (заклікаюць яны чалавецтва звярнуць увагу на самога сябе), што з намі дзеецца. Мы ж выміраем! Дэградуем ушчэнт і ў геаметрычнай прагрэсіі! А ўсё гэта яны — камунальныя зручнасці, інтэрнацкія выгоды, рэчы першай неабходнасці і г. д. і г. д. Гэта яны ва ўсім вінаваты.

Наогул, калі казаць шчыра, то гаспадарчая сістэма сучаснага інтэрната нікога, акрамя распешчаных сібарытаў, выхаваць не здольна. Апошнія дасягненні навукі, тэхнікі, прамысловасці ў прамым сэнсе гэтага слова прымушаюць чалавека сядзець склаўшы рукі. Яны пазбаўляюць яго цудоўнай магчымасці ўдасканальваць свае фізічныя здольнасці (акрамя як на спартыўных пляцоўках) усюды, і ў першую чаргу ў штодзённай гаспадарчай дзейнасці. Не патрэбна насіць ваду са Свіслачы на дзесяты або дванаццаты паверх, падтрымліваць вогнішча, шукаючы па навакольнаму раёну сухое галлё, мыць бялізну ў халоднай рачной вадзе... Як бачыце, карціна досыць змрочная. Хіба ж так жылі нашы далёкія, слаўныя прашчуры?..»

І ўсё ж неабходна прызнаць, што становішча не зусім такое, як уяўляецца паважаным прадстаўнікам жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Зазірнём, напрыклад, у інтэрнат № 4. Калі вам здарыцца надвячоркам падняцца на чацвёрты паверх, каб завітаць у адну або другую студэнцкую кухню, то вы напэўна станеце сведкамі такой з'явы: у прыцемках, наскокваючы адна на адну, ля газавых пліт мітусяцца дзяўчаты, навобмацак засыпаючы спецыі ў каструлі. Ведаеце, ёсць у гэтым, пазбаўленым электрычнага святла непраглядным пекле нешта такое, чаго, мабыць, не зведалі электрык інтэрната У. Я. Рудзьман і камендант М. С. Сердзюкоў. Будзем паміж сабой называць гэта «нешта» найбольш апаэтызавана: першабытная рамантыка пячорнага існавання.

Такая ж самая «рамантыка» чакае вас і паверхам вышэй. Але ў той момант, калі я пераступіў цёмны парог кухні-«пячоры», раптам запалілася свят-

● СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС ●

# «...МНЕ СНЯЦЦА СНЫ АБ «КАМУНАРЦЫ»

**У ІНТЭРНАЦЕ № 2 адбылася сустрэча з дэлегатам XXVI з'езда КПСС, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, перадавіком вытворчасці, брыгадзірам Мінскай кандытарскай фабрыкі «Камунарка» Ліліяй Іванаўнай Вышынскай.**

КАЛІ ІШЛА запрашаць яе на сустрэчу — хвалявалася. А раптам адмовіцца. Усё ж не так многа вольнага часу ў такіх людзей, як Лілія Іванаўна. Але на маё запрашэнне яна адказала:

**— Абавязкова прыйду. Я вельмі люблю моладзь.**

І вось гэтая сустрэча адбылася. З захапленнем слухалі студэнты расказ Ліліі Іванаўны аб сваім жыцці, аб працы, успаміны аб экскурсіях у Марока, Нігерыю, на Кубу.

Самастойны шлях пачала яна ў шаснаццаць гадоў, тады, калі засталася працаваць на матавелазаводзе. Любіла дзяўчына тэхніку, але...

**— Былі мы неяк на экскурсіі на кандытарскай фабрыцы «Камунарка». Мора рознакаляровых цукерак, салодкае паветра ў цэхах. Адразу захацелася тут працаваць. Нездарма ж кажуць, што першае ўражанне вельмі падманнае. Прыцягнула мяне да сябе сваімі непаўторнымі пахамі «Камунарка». І толькі тады, калі стала тут працаваць, зразумела, наколькі салёная гэта праца.**

Больш за дваццаць гадоў працуе Л. І. Вышынская на фабрыцы «Камунарка» і ніколькі аб гэтым не шкадуе. Чароўная «фея», салодкая «медуніца», пахучы «чабарок», прыгожа афармленыя пакункі «арахісавых», «маскі», «асарці»... Бясконца можна пералічваць назвы цукерак, якія выпускае сёння фабрыка. Іх ужо каля 180. А зусім нядаўна гэты багаты асартымент папоўніўся яшчэ адной назвай — «лілія». Новы гатунак цукерак брыгада назвала ў гонар свайго брыгадзіра Ліліі Іванаўны Вышынскай.

Трынаццаць гадоў назад узначаліла яна гэту, раней адстаючую, брыгаду.

**— Добра памятаю, як прыйшла да дырэктара ў пакой і папрасіла: хачу працаваць у гэтай брыгадзе.**

Сваёй стараннай працай, умелым падыходам да людзей Лілія Іванаўна заваявала павагу ў калектыве. І як узнагарода за гэта — яе брыгада ў ліку першых датэрмінова выканала план IX—X пяцігодак. За гэта брыгадзір была ўзнагароджана ордэнамі Працоўнай Славы II і III ступеней, а брыгада прызнана лепшай на фабрыцы.

Любіць Лілія Іванаўна ўспамінаць пра дні работы XXVI з'езда КПСС, дэлегатам якога яна была выбрана:

**— Працавала я тады ў другую змену, калі пазванілі з райкома партыі: «Лілія Іванаўна, віншуем, вы выбраны дэлегатам XXVI з'езда партыі». На ўсё жыццё застануцца ўспаміны аб з'ездзе.**

А колькі гонару было за сваіх дзяўчат з брыгады, калі там, у Маскве, яна атрымала тэлеграму. «Лілька, працуй у Маскве і не хвалюйся, а мы тут працуем за цябе». Яны, яе дзяўчаты, родны ёй калектыў, былі з ёю.

**— І ўсё ж дзе б я ні была,— гаворыць Лілія Іванаўна, — ці ў доме адпачынку, ці ў паездцы па краіне — без брыгады, без маёй любімай працы я не магу. Нават там мне сняцца сны аб «Камунарцы»...**

**Н. ТРУБЧЫК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

● ЗАПРАШАЕМ ДА КОНКУРСУ ●

# САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БАЛГАРЫІ — 40 ГАДОЎ

9 ВЕРАСНЯ 1944 года... Гэты дзень залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю балгарскага народа. 9 верасня 1944 года працоўныя Балгарыі пад кіраўніцтвам партыі камуністаў і пры дапамозе Савецкай Арміі заваявалі поўную перамогу над фашызмам, беззваротна знішчылі капіталістычную эксплуатацыю і сталі на сацыялістычны шлях развіцця.

Камітэт ЛКСМБ, аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы і балгарскае зямляцтва аб'яўляюць конкурс, прысвечаны 40-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі.

Удзельнікі конкурсу павінны адказаць на наступныя пытанні:

**1. Хто заснаваў Балгарскую сацыял-дэмакратычную партыю ў 1891 годзе? Што вы ведаеце аб яго дзейнасці ў Расіі?**

**2. Што вам вядома аб жыцці і дзейнасці Г. Дзімітрава ў СССР пасля лютага 1934 года?**

**3. Што вам вядома пра падзеі 2 верасня 1944 года, пра ролю Савецкага Саюза ў перамозе сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі?**

**4. Дзе і ў якіх баях супраць фашысцкай Германіі прымала ўдзел Балгарская Народная Армія?**

**5. Калі Балгарыя стала Народнай Рэспублікай?**

**6. Назавіце буйнейшыя прамысловыя аб'екты, якія з'яўляюцца дзецішчам савецка-балгарскай дружбы?**

**7. Калі быў створаны Дзімітраўскі Камуністычны Саюз Моладзі? Якімі ордэнамі і за што ўзнагароджаны ДКСМ?**

**8. Назавіце беларускія гарады, якія з'яўляюцца пабрацімамі гарадоў НРБ?**

**9. Калі быў ажыццёўлены савецка-балгарскі касмічны палёт і хто прымаў удзел у ім?**

**10. Што вы ведаеце аб свяце балгарскіх студэнтаў?**

**11. Калі быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж БДУ імя У. І. Леніна і Сафійскім універсітэтам імя К. Ахрыдскага? Што вы ведаеце аб сяброўскіх сувязях універсітэтаў-пабрацімаў?**

Конкурсныя матэрыялы павінны паступіць у камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна (п. 306, галоўны корпус) да 30 красавіка гэтага года.

ло! Не, нічога незвычайнага не здарылася, ніхто нічога не адрамантаваў. Проста гэтаму паверху менш пашанцавала на «рамантыкаў» жыцця, а празаікі прынеслі на кухню таршэр і пры яго дапамозе пачалі нешта смажыць сабе на вячэру. Атрымалася амаль што як у апошняй чвэрці дваццатага стагоддзя.

Наогул, наведаўшы «чацвёрку», павінен вам далажыць: шмат рэчаў на свеце існуе невядома для чаго. У тым сэнсе, што і без іх студэнт усё ж яшчэ здольны існаваць. Да такіх «дробязей» адносяцца фіранкі на вокнах, плафоны да лямп, вешалкі, рэпрадуктары, настольныя лямпы, крэслы... Словам, тут у пэўнай меры выконваецца спартанскі прынцып: лепшы спосаб навучыць жыць — гэта навучыць жыць без нічога.

А цяпер пройдземся па шматпавярховым універсітэцкім інтэрнаце № 2.

«Калі б жаданні былі лашакамі, то студэнты ездзілі б тут конна» — магчыма, такі варыянт вядомай англійскай прыказкі з'яўляецца найбольш любімым у каменданта інтэрната А. М. Нурметавай. За дакладнасць гэтага паручыцца цяжка, але, мяркуючы па тым, як ідуць справы ў інтэрнаце, лёгка зрабіць вывад, што каб жаданні былі сапраўды лашакамі, то студэнты і спалі б у сёдлах.

Прывядзём такія лічбы: з 80 кухонных ракавін, якія размешчаны на паверхах інтэрната, спраўнымі на гэты момант з'яўляюцца толькі 17 (семнаццаць!). Калі справы ў сантэхнікаў і далей будуць рухацца такім чынам, то меркаванне наконт таго, што ваду ў інтэрнат можна насіць са Свіслачы (дзякуй, што цячэ побач), зусім не пазбаўлена рэальнай перспектывы.

Яшчэ адна лічба: на сённяшні дзень у інтэрнаце не працуе 26 газавых гарэлак. Кожная трэцяя пліта знаходзіцца ў аварыйным становішчы.

Трэба так разумець, што і камендант А. М. Нурметава, і кастэлянша С. А. Баркоўская таксама прытрымліваюцца спартанскіх поглядаў на выхаванне моладзі, бо пасцельная бялізна з іх шчырай ласкі не мяняецца ў інтэрнаце па дваццаць і болей дзён, у той час як яны абавязаны забяспечваць жыхароў пасцельнымі рэчамі не пазней, чым праз кожныя дзесяць дзён.

Калі дадаць да ўсяго гэтага тое, што вось ужо два гады у «двойцы» не працуе радыёвузел, на многіх паверхах не абсталяваны бытавыя памяшканні, а праз разбітыя шыбы дзвярэй, што вядуць на лесвічныя пляцоўкі, у пакоі раз-пораз урываюцца бадзёрыя вятры ўсіх пораў года, то не цяжка сабе ўявіць, як пакрысе, мужнеючы ў барацьбе са стыхійнымі наваламі, студэнты з «двойкі» будуцьператварацца ў спрактыкаваных пітэкантрапаў.

**В. ЧАРНЯУСКІ.**

● А ЯК У ВАС? ●





# СУ-БОТ-НІК!!!

ПЕРШАЙ ДУМКАЙ, якая прамільгнула ў галаве, калі я прачытала аб'яву пра суботнік, была кудынебудзь «змыцца». Але, як на грэх, ніякай добрай прычыны, каб збегчы, не знайшлося. Тады я вырашыла даведацца, які настрой у астатніх жыхароў паверха. Прайшлася па калідоры з канца ў канец — дзіўная цішыня. Раней у гэты час было шумна, а сёння паверх маўчаў, быццам насельніцтва затаілася ў сваіх пакоях і чакае рашучага моманту: быць суботніку ці не. Адкрылася вачам і нешта іншае — кухня нагадвала сметнік, бо час набліжаўся к вечару, чытальная зала выглядала крыху лепш, а ў ліфтавой сцены закапцелі ад цыгарэтнага дыму. Словам, паверх як паверх.

Вяртаюся ў свой пакой, і ведаеце, што? Наша Марына бачыла ўжо сёмыя сны. Я хвалююся, лётаю, разрываюся, шукаючы аднадумцаў, тых, хто на работу таксама выходзіць не хоча, а яна — на дзіва самаўпэўнены чалавек — разляглася і спіць сабе, як пшаніцу прадаўшы. Доўга не думаючы, я таксама юркнула ў ложак... І адразу ж уявіўся наш калідор, чысты, прыгожы, у дзверы яго льецца нейкі загадкавы ружовы свет, а навокал — кветкі, мноства кветак. І так хораша ўсім жыхарам, так прыемна, быццам знаходзяцца яны ў казцы... Але раптам: «Дык што гэта вы сабе думаеце?» Імгненна адкрываю вочы — на парозе стаіць Гена, прадстаўнік нашай мясцовай улады. Сон, як спуджаны верабей, адлятае ад нас з Марынай, і праз імгненне мы ўжо ў чытальнай зале. Праходзіць некалькі доўгіх мінут. Паціху збіраецца народ. А тут і Вадзік магнітафон прынёс...

А ці ведаеце вы, як прыемна працаваць пад музыку? У такт ёй згінаюцца і разгінаюцца рукі, ногі на месцы стаяць не могуць—бегаеш ад сцяны да сцяны, водзіш анучай па дзвярах—і ў дадатак спяваць яшчэ хочацца. Не верыце? У такім разе самі паспрабуйце арганізаваць суботнік на сваім паверсе, знайдзіце добрую мелодыю — і вы зразумееце, што мы адчувалі ў тыя хвіліны. Жаданне працаваць узрастала ў геаметрычнай прагрэсіі. Песні, шум вады, шорганнеануч па сцяне, гумар — усё гэта перамешвалася ў цудоўную музыку — музыку працы. І нават не верылася, што зусім нядаўна я хацела збегчы ад гэтага суботніка як мага далей

Пасля работы сабраліся зноў у чытальнай зале, якая цяпер аж ззяла ад чысціні, і дружна крыкнулі «ур-ра» — ад добрага настрою, ад радасці працы і ад вынікаў сваіх намаганняў. **І. КЕЗІК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



## ПРЭСАЎТАКЛУБ

# НЕ СПЯШАЙСЯ, СТУДЭНТ!

АМАЛЬ палова ўсіх дарожна - транспартных здарэнняў адбываецца па віне пешаходаў. Каб забяспечыць у нашым горадзе пешаходу максімальную бяспеку, прыкладаецца нямала намаганняў. І ўсё ж гэтага недастаткова. Палова ўсіх здарэнняў у мінулым годзе адбылася па віне пешаходаў.

Асабліва насцярожвае тое, што вялікая колькасць дарожных здарэнняў бывае з-за нядбайнасці людзей, якім правілы дарожнага руху вядомы, як кажуць, ад «А» да «Я». Я маю на ўвазе студэнтаў. Прывяду некаторыя прыклады. Студэнт І курса інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі М. Аляхновіч пераходзіў вуліцу перад блізка ідучым транспартам і быў збіты аўтамашынай. Студэнтка І курса Мінскага тэхналагічнага інстытута А. Цагальская пераходзіла перакрыжаванне вуліц Ульянаўскай і Свярдлова на забараняючы сігнал светафора і таксама атрымала траўму. Аналагічныя выпадкі адбыліся і са студэнтамі БПІ В. Станкевіч і Мінскага медыцынскага інстытута В. Жук і іншымі.

Зразумела, што пацярпеўшыя добра ведалі правілы дарожнага руху, аднак па той прычыне, што не выконвалі іх, трапілі ў бальніцу.

З 1 верасня 1983 года ўступіў у сілу Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 сакавіка 1983 года «Аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правіл дарожнага руху». Адпаведна з артыкулам 10 Указа пешаходы за непадпарадкаванне сігналам рэгулявання дарожнага руху, за незахаванне патрабаванняў дарожных знакаў папярэджваюцца або штрафуюцца ў размеры трох рублёў. Калі ж у выніку парушэнняў былі пашкоджаны транспартныя сродкі, дарогі, дарожныя збудаванні, то размер штрафу павялічваецца ад 5 да 30 рублёў.

Праблема ўмацавання дысцыпліны пешаходаў у справе забеспячэння бяспекі дарожнага руху з'яўляецца адной з важнейшых і патрабуе ад адміністрацыі арганізацый, грамадскасці карэннага паляпшэння прафілактычнай работы. Але ні адзін работнік міліцыі, ніякая грамадскасць не зможа выратаваць ад бяды таго, хто не выконвае правілы дарожнага руху. Кожны з нас павінен выпрацаваць у сабе цвёрдую прывычку: строга прытрымлівацца гэтых правіл.

**М. ВАСІЛЬЕЎ,**
**супрацоўнік ДАІ.**

## З НАШАЙ ПОШТЫ

# ШЛЯХАМІ ЛЁСУ

**Імя першадрукара Івана Фёдарава добра вядома як у нашай краіне, так і за яе межамі. Паводле рашэння ЮНЕСКО у 1983 годзе шырока адзначалася 400-годдзе з дня смерці Івана Фёдарава, што з'яўляецца міжнародным прызнаннем ролі, якую адыграў у гісторыі сусветнай культуры вялікі гуманіст і асветнік.**



ЯК ВЯДОМА, месца і год яго нараджэння да апошняга часу не былі ўстаноўлены нават адносна дакладна. Такое ж становішча і з вызначэннем яго сацыяльнага статуса — дзякан у царкве Міколы Гастунскага, і раптам такая надзвычайная адукаванасць! Займаючыся ў Кракаўскім універсітэце даследаваннем старадаўніх дакументаў, якія датычаць кніжнай справы, прафесар Я. Л. Неміроўскі знайшоў дакументы, якія мелі непасрэднае дачыненне да першадрукара. У Кракаўскім універсітэце, дзе занатоўваліся імёны тых, хто атрымліваў вучоную ступень бакалаўра ці магістра, быў выяўлены важны запіс: у 1532 годзе сярод іншых быў удастоены «Іван Фёдараў Масквіцін».

У другім дакуменце ва універсітэцкай метрыцы быў выяўлены запіс: «Іван сын Фёдара з Петкавіч». Даследчыкам было ўстаноўлена па дакументах, што ніякіх іншых Іванаў Фёдаравых у той перыяд (першыя чатыры дзесяцігоддзі XVI стагоддзя) у Кракаўскім універсітэце не было, і што размова ідзе тут аб адной і той жа асобе. Цікава і другое, што гады вучобы ў Кракаўскім універсітэце Івана з Петкавіч (ён жа Іван Масквіцін) добра ўпісваюцца ў агульны жыццяпіс Івана Першадрукара.

З другога боку, як было паказана на падставе дасканальнага азнаямлення з геаграфічнымі рэаліямі таго часу (зразумела, па дакументах), на ўсёй тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і Польшчы былі вядомы ўсяго тры населеныя пункты, якія насілі такую назву, усе яны знаходзіліся ў Мінскім, Вілейскім і Навагрудскім паветах.

Гіпотэза аб беларускім паходжанні Івана Фёдарава знаходзіць цікавае пацвярджэнне зусім з іншага боку — з боку геральдыкі. Як вядома, амаль усе друкары мелі свой знак і, інакш кажучы, прафесійную марку. Меў такі «знак» і Іван Фёдараў. Знак гэты паяўляецца ў яго кнігах не адразу, а ўпершыню толькі ў львоўскіх выданнях, найперш у «Апостале» 1574 года, а потым і ў іншых яго кнігах гэтага перыяду.

Яшчэ да рэвалюцыі рускія вучоныя звярнулі ўвагу на падабенства друкарскай маркі Івана Фёдарава са шляхецкімі гербамі «Шрэнева». Значна пазней адзін з буйнейшых знаўцаў геральдыкі прафесар Уладзіслаў Лукомскі пераканаўча даказаў, што малюнак друкарскага знака Івана Фёдарава тоесны гербу беларускага шляхецкага роду Рагоза, і гэта нельга вытлумачыць інакш, як тым, што першадрукар або належаў да гэтага шляхецкага роду, або быў прыпісаны да яго актам так званай адаптацыі. (Існаваў у Вялікім княстве Літоўскім звычай, згодна з якім уладальнік шляхецкага тытула і, зразумела, уласнага герба, мог прыпісаць да яго чалавека, які аказаў яму нейкую вялікую паслугу).

У гэтай знаходцы цікава тое, што вядомыя ў гісторыі Рагозы паходзяць з Мінскага павета (успомнім Петкавічы).

І яшчэ, праўда, ускосныя пацвярджэнні беларускага паходжання Івана Фёдарава, на якія не звярталі ўвагі папярэднія даследчыкі. Як вядома, у Маскоўскай дзяржаве першадрукар пісаўся «Іван Фёдараў», а ў Вялікім княстве Літоўскім у сваіх выданнях, а таксама ў розных дакументах ён пісаўся «Іван Фёдаравіч» або «Іван Хведаравіч». Пераход літары **«ф»** у **«х»** з'яўляецца тыповым для беларускай і украінскай моў. Але вось прыбаўленне суфікса **«-віч»** у прозвішчы з'яўляецца тыповым толькі для беларускай мовы. У Маскоўскай дзяржаве ў XV—XVIII стагоддзях толькі вялікія князі і цары ў знак асобай ласкі жалавалі князёў і баяр прывілеяй пісаць імя па бацьку і прозвішча з канчаткам **«-віч»**. За правільным ужываннем канчатка **«-віч»** у тыя гады вельмі строга сачылі, каб не змешваць знатных людзей з нерадавітымі.

На наш погляд, першадрукар, вярнуўшыся на радзіму, прыняў напісанне свайго прозвішча ці імя па бацьку (пакуль нам гэта яшчэ невядома) па звычаю свайго народа.

Да цяперашняга часу па-за ўвагай даследчыкаў засталася і мова друкара. Як вядома, Іван Фёдараў свае творы друкаваў на царкоўна-славянскай мове — літаратурнай мове Маскоўскай дзяржавы таго часу і афіцыйнай мове праваслаўнай царквы. Але ў яго прадмовах, пасляслоўях і іншых дакументах мы сустракаем шмат старабеларускіх слоў. Мы нават ведаем, што ў Заблудаве, у маёнтку вярхоўнага гетмана Вялікага княства Літоўскага Рыгора Хадкевіча існаваў першапачатковы план выдаць Вучыцельскае Евангеліе на беларускай мове. «Думаў было пра тое,— пісаў Р. Хадкевіч у прадмове да гэтай кнігі,— каб перакласці гэтую кнігу на простую мову, каб была зразумелай людзям простым, і вельмі клапаціўся аб гэтай справе».

Перад лінгвістамі стаіць задача дасканалага вывучэння мовы Івана Фёдарава і гэтым самым пацвярджэння гіпотэзы аб беларускім паходжанні друкара.

**А. БЕЛЫ,**
**выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў.**

## ФОТАКОНКУРС



**«Зімы апошні подых...»** **А. ВАЛОШЫН.**

## АРЫЕНЦІР У КНІЖНЫМ МОРЫ

# НОВЫЯ ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ

У МАГАЗІН № 28 «Палітычная кніга» паступілі новыя вучэбныя дапаможнікі:

**ОВСЯННИКОВ М. Ф. «История эстетической мысли».**

У кнізе дадзена гісторыя развіцця эстэтычнай думкі ад старажытных часоў да ўзнікнення марксізму. Паказаны асноўныя этапы гісторыі развіцця эстэтычнай думкі антычнасці, сярэдневякоўя, эпохі Адраджэння, класіцызму, рамантызму, нямецкай класічнай эстэтыкі, рэалізму XIX стагоддзя і ўзнікнення марксісцкай эстэтыкі.

Кніга прызначаецца для студэнтаў філасофскіх факультэтаў універсітэтаў і ВНУ мастацтваў.

**ТИХОМИРОВ О. К. Психология мышления.**

У першым у нашай краіне вучэбным дапаможніку па аднаму з раздзелаў курса «Агульная псіхалогія» аўтар паказвае, як даследаванні мыслення ўзбагачаюць канкрэтна-навуковыя ўяўленні аб сутнасці псіхічнага адлюстравання, дзейнасці, самасвядомасці асобы. У кнізе абагульнены даследаванні айчынных псіхолагаў, крытычна асэнсаваны вопыт развіцця сусветнай псіхалагічнай навукі, сістэматызаваны асабістыя даследаванні аўтара і яго вучняў.

Дапаможнік прызначаны для студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў факультэтаў і аддзяленняў псіхалогіі. Будзе карысным таксама філосафам, педагогам, фізіёлагам, лінгвістам, спецыялістам па «штучнаму інтэлекту», эканамістам, сацыёлагам.

**М. СПОРЫНА,**
**таваразнаўца.**

# ЗАПРАШАЕМ НА ВЫСТАЎКУ

ЦЭНТРАЛЬНЫ кніжны магазін запрашае наведаць выстаўку-продаж літаратуры, прысвечанай 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На выстаўцы можна выбраць выданне па густу: фотаальбомы, літаратуру ваенна-палітычнай тэматыкі, мастацкую літаратуру, выяўленчую прадукцыю.

**СИНЬКЕВИЧ Н. В. По местам ратной славы.**

Альбом-малютка, ілюстраваны каляровымі фотаздымкамі, пазнаёміць з памятнымі мясцінамі Беларусі, дзе праходзілі гераічныя баі з ворагам.

**Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944): Краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе.**

У кнізе раскрываецца арганізацыйная будова партызанскіх сіл Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, даюцца кароткая гісторыя ўтварэння і развіцця атрадаў, брыгад, злучэнняў і звесткі аб іх камандным саставе і колькасці. Дадзены ўказальнікі — імянны і фарміраванняў.

**МАЧУЛЬСКИЙ Р. Н. На огненной земле.**

Былы сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі піша аб арганізацыі партызанскага руху і кіраўніцтве ім на тэрыторыі вобласці ў гады акупацыі, праўдзіва і шчыра расказвае пра баявых сяброў.

**Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны.**

У альбом увайшлі фотаздымкі экспанатаў, якія знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, самым буйным у Беларусі сховішчы дакументаў і рэліквій мінулай вайны.

**Л. КАРЭННАЯ,**
**таваразнаўца.**

# МОЖНА НАБЫЦЬ

У КНІЖНЫМ кіёску БДУ імя У. І. Леніна ёсць у продажы наступныя кнігі:

**ДОВГЯЛО Г. И. Становление идеологии раннеклассового общества.**

**ИЛЬЯЩУК Г. И. В. И. Ленин о политическом банкротстве меньшевизма.**

**Идеалы и нормы научного исследования.**

**БЕЛЬСКИЙ А. М. и др. Пространственная структура лазерного излучения.**

**СУДАРИКОВ С. А. и КАПУЦКИЙ Ф. Н. Физическая химия.**

**ЗАГОРУЛЬСКИЙ Э. М. Возникновение Минска.**

**БЕРКОВ В. Ф. Структура и генезис научной проблемы.**

**Геология и география. Вып. 4-й.**

**КУЛЕШОВ Ф. И. Лекции по истории русской литературы конца XIX—начала XX в.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10133 Зак. 511

22 сакавіка 1984 г.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ